# ⌘ ПАЛЕМІКА

Шаноўная рэдакцыя ARCHE!

Мне было б вельмі цікава прачытаць на старонках часопісу абмеркаваньне пытаньня прагрэсіўнасьці ўва ўмовах Беларусі, а таксама хто і як ацэньвае прагрэс грамадзкай думкі.

Юры Дракахруст у мінулагоднім выпуску «ARCHE» піша, што «паводле адпаведных зьвестак, расейскамоўныя пераўзыходзяць у «прагрэсіўнасьці», «эўрапейскасьці» і г. д. ня толькі беларускамоўных, але і ўсе прамежкавыя моўныя групы». І далей: «Самая «прасунутая», «прагрэсіўная» група ў сэнсе палітычных памкненьняў — гэта расейскамоўныя этнічныя беларусы».

Гэтая высноўа робіцца сп. Дракахрустам на падставе сацыялягічнага апытаньня, якое быццам зьвязвае моўныя паводзіны і геапалітычныя прыхільнасьці апытаных у Беларусі. Паводле апытаньня, толькі 14,6 адсотка тых, хто гаворыць па-беларуску, адказалі, што яны *за* далучэньне да Эўразьвязу (ЭЗ) у выпадку, калі б давялося выбіраць паміж Расеяй (РФ) і ЭЗ. У той жа ж час аж 45,1 адсотка расейскамоўных у Беларусі выказаліся *за* далучэньне да ЭЗ, калі б давялося выбіраць.

Цікава, што Дракахруст выснову пра «прагрэсіўнасьць» робіць на падставе выбару палітычнага далучэньня да іншых геапалітычных цэнтраў.

Як на мой розум, прэфэрэнцыя далучэньня да іншых геапалітычных цэнтраў, як гэта сфармулявана ў апытаньні, зусім не аўтаматычнае сьведчаньне прагрэсіўнасьці паглядаў, бо мае на ўвазе далучэньне да кагосьці мацнейшага, хто забясьпечыць лепшае жыцьцё. Цікава было б бачыць вынікі апытаньня сярод расейскамоўных наконт таго, з чым яны асацыююць ЭЗ. Я не пабаюся пайсьці ў заклад, што асацыяцыя гэтая — з эканамічнымі дабротамі. Тое самае вам скажуць і беларускамоўныя пра Расею, бо пераважна туды толькі і могуць паехаць — больш грошай, праца, кілбаса. Вось і ўсё, што дэманструе адказ з абодвух лягераў. Абедзьве групы з аднолькавым энтузіязмам галасуюць за патэнцыйнага працадаўцу, якога ведаюць. Дык у чым прагрэс грамадзкага думаньня? Гэта зусім што іншае, чым асэнсаваньне сябе як геапалітычнай асобнасьці і каштоўнасьці, і ўжо адсюль фармуляваньне геапалітычнай арыентацыі і магчымых палітычных сувязяў.

Сапраўдным прагрэсам для Беларусі і было б гэтае самае фармуляваньне ўласнага інтарэсу як геапалітычнай адзінкі. Беларусы цалкам могуць сябе атаясамліваць з Эўропай, але гэта зусім ня тоеснае жаданьню далучыцца да нейкай эўрапейскай палітычнай адзінкі, як ЭЗ, бо гэта можа і ня быць у інтарэсах Беларусі.

Або апытаньне ня мела на мэце выявіць «прагрэсіўнасьці», або фармулёўкі няўдалыя для таго, каб сапраўды адказаць на пытаньне пра яе. І ў тым і ў другім выпадку сп. Дракахруст таўчэ ваду ў ступе, бо, як ні круці, падставаў для яго высноваў апытаньне зусім не дае. Яго асэнсаваньне таго, што б гэта значыла, гэткае ж спэкулятыўнае, як і маё.

*Алеся Сёмуха*